# Рэдакцыйная калонка

Пасля дваццаці пяці гадоў маўчання “Журнал беларускіх даследаванняў” аднаўляе сваю дзейнасць. Адроджаны “Журнал” стане платформай, на якой беларускія і заходнія беларусісты змогуць друкаваць свае даследаванні.

Часопіс будзе выходзіць па-англійску і па-беларуску. З аднаго боку, гэта дазволіць беларусам прадставіць краіну і яе развіццё са сваёй перспектывы на ангельскай мове і ў адпаведнасці са стандартамі заходніх рэцэнзаваных выданняў. З дапамогай часопіса заходнія акадэмічныя структуры бліжэй пазнаёмяцца з беларускімі даследнікамі.

З іншага боку, беларуская версія часопіса дапаможа заходнім беларусістам патрапіць у мэйнстрым беларускага навуковага жыцця і прабіцца да больш шырокага кола чытачоў у Беларусі.

Згодна з даўняй традыцыяй “Журнала”, заснаванага яшчэ ў 1965 годзе, у яго новай версіі будуць артыкулы з розных дысцыплін заходніх і беларускіх даследнікаў, што працуюць як у Беларусі, так і за яе межамі.

У гэтым нумары Андрэй Катлярчук, беларускі даследнік са Швецыі, вывучае сучасную палітыку памяці ў Беларусі на прыкладзе новых помнікаў ахвярам Галакосту, генацыду цыганоў і масавага забойства прадстаўнікоў польскай меншасці падчас Другой сусветнай вайны.

Аўтар аналізуе, як міфалогія Другой сусветнай вайны эксплуатуецца для вырашэння актуальных палітычных задач. Доктар Катлярчук праводзіць цікавыя паралелі паміж палітыкай памяці ў Беларусі і ва Ўкраіне, дзе ўжо былі зробленыя крокі да прымірэння з Польшчай і Расіяй. Беларусь сутыкаецца з тымі ж праблемамі, што і Ўкраіна, – а менавіта з нежаданнем ушаноўваць памяць вынішчаных цыганоў і імклівым ростам мемарыялізацыі Галакосту.

У тэксце Дэвіда Марплза з Канады даследуецца геапалітычнае балансаванне, якога трымаюцца беларускія ўлады. Ён звяртае ўвагу на тое, што Беларусь разглядае Еўрапейскі Саюз і Расію як два асобныя і супрацьлегла скіраваныя блокі ўлады, што імкнуцца далучыць Беларусь да сябе, – пры гэтым неістотна, сутыкаюцца інтарэсы ЕС і Расіі тут ці не. Абедзве суседкі адпавядаюць такому партрэту: ЕС накладае санкцыі на Беларусь пасля выбараў, Расія ж прызнае гэтыя выбары свабоднымі і справядлівымі.

Доктар Марплз сцвярджае, што, калі Расія будзе надта ціснуць на беларускія ўлады, яны павернуцца да Еўропы і – для дасягнення сваіх задач – выпусцяць з турмаў найбольш уплывовых палітычных вязняў. Па сутнасці,

гэта палітычная гульня, правілы якой вызначае не столькі Брусель ці Масква, колькі Менск. У артыкуле таксама разглядаюцца іншыя няпростыя пытанні – напрыклад, ці мае ЕС рацыю, навязваючы свае геапалітычныя і маральныя меркаванні пра былы савецкі рэжым, калі вялікая частка насельніцтва задаволеная тагачасным урадам і стандартамі жыцця.

Прафесар Арнольд Макмілін з Лондана актыўна друкаваўся ў “Журнале” ў мінулым. У гэтым нумары яго артыкул прысвечаны паэзіі беларусаў, пакараных пазбаўленнем волі за “злачынства”, якое заключалася ў супраціўленні палітычным сістэмам ці ў абароне свабод нацыянальных і рэлігійных меншасцяў. Ён надзвычай цікава расказвае пра беларускіх паэтаў у польскіх, савецкіх і сучасных беларускіх турмах. Прафесар Макмілін ілюструе свой артыкул запамінальнымі прыкладамі з жыцця паэтаў – напрыклад, гісторыяй Сяргея Новіка-Пеюна (1906–1994), якога спачатку арыштавалі польскія ўлады, затым зняволілі нямецкія захопнікі і, урэшце, выслаў у савецкія лагеры Сталін.

Нарэшце, даследніца з Гродна, Наталля Сліж, разглядае законы і традыцыі, згодна з якімі адбывалася выпасажанне шляхцянак Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стагоддзях. Доктар Сліж закранае такія пытанні, як парадак размеркавання пасагаў, змест пасагу, квіт пра яго атрыманне і карыстанне пасагам. Яна апісвае некалькі цікавых выпадкаў выпасажання шляхцянак, якія яскрава ілюструюць асаблівасці тагачаснага жыцця на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Нумар таксама змяшчае кніжныя рэцэнзіі айца Аляксандра Надсана, прафесара Арнольда Макміліна і Паўлы Бароўскай. Джым Дынглі прадстаўляе сціслы агляд апошніх падзей Англа-беларускага таварыства. У канцы нумара дадзены агляд інтэрнэт-старонак беларускіх аналітычных цэнтраў, якія маглі б дапамагчы замежным даследнікам лепей зразумець Беларусь.

ЯРАСЛАЎ КРЫВОЙ